**Віншаванні да 50-годдзя ўстановы адукацыі**
**«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»**

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь

Калектыву ўстановы адукацыі ”Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў“

Дарагія сябры!

Сардэчна віншую вас з 50-годдзем з дня заснавання Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Дзякуючы нястомнай працы некалькіх пакаленняў педагогаў універсітэт з’яўляецца вядомай установай адукацыі ў Беларусі і далёка за яе межамі.

Працягваючы добрыя традыцыі, вы з гонарам выконваеце задачу па выхаванні сучасных прадстаўнікоў сферы культуры. Вашы выпускнікі – апантаныя справай высокакваліфікаваныя спецыялісты, якія штодзённа напаўняюць духоўную скарбніцу нашай краіны стваральным зместам, уносяць уклад у развіццё нацыянальнага мастацтва і годна прадстаўляюць сваю Радзіму на міжнароднай арэне.

Упэўнены, што і надалей ваша дзейнасць будзе такой жа плённай, самаадданай і багатай на новыя здзяйсненні.

Жадаю вам моцнага здароўя, шчасця і натхнення.

Аляксандр Лукашэнка

8 кастрычніка 2025 года